Медыцына

Без талончыка. Платныя паслугі прапануюць многія медустановы, у тым ліку і Ляхавіцкая ЦРБ

07/04/2018 409 redakcyja 0 Comment

Бясплатнасць і даступнасць медыцыны гарантуюцца Канстытуцыяй. Але бясплатная для насельніцтва яна абыходзіцца дзяржбюджэту ў важкія фінансавыя затраты. Часцей за ўсё людзі пра гэта не задумваюцца. Калі трэба трапіць на прыём да ўрача, дастаткова ўзяць талончык і дачакацца сваёй чаргі. Але бываюць і такія сітуацыі, калі чалавек хоча абследавацца без паказанняў – звышпланава, па-за чаргой і г.д. У такім выпадку можна скарыстацца платнымі паслугамі. Іх прапануюць многія медустановы, у тым ліку і Ляхавіцкая ЦРБ. І няхай даход ад такіх паслуг у нашай райбальніцы складае ўсяго каля 5 працэнтаў тых сумаў, што ў бюджэце прадугледжаны на ахову здароўя, але і ён накіроўваецца на развіццё аховы здароўя – набыццё неабходных матэрыялаў і абсталявання, павышэнне заработнай платы медперсаналу.

25 ФЕВРАЛЯ 2024 ГОДА ЕДИНЫЙ ДЕНЬ ГОЛОСОВАНИЯ

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

У БЕЛАРУСІ 2024 ГОД ПРАХОДЗІЦЬ ПАД ЗНАКАМ ЯКАСЦІ



Наколькі запатрабаваны платныя медыцынскія паслугі ў ляхавічан, што ў гэтым плане сёння прапаноўвае райбальніца і пра многае іншае – у размове з галоўным урачом Ляхавіцкай ЦРБ Георгіем ХЛЯБОВІЧАМ, які сцвярджае:


– Меддапамога грамадзяніну краіны заўсёды будзе аказана поўная і прафесійная. Справа ў іншым: пэўны плюс платных паслуг у эканоміі асабістага часу. Па-за чаргой можна зрабіць, напрыклад, эндаскапічную дыягностыку страўніка, прайсці іншыя дыягнастычныя даследаванні. Пералік паслуг, што прапаноўвае наша райбальніца, усяго на 15-20 працэнтаў меншы, чым у медустановах буйных гарадоў, а аснашчанасць сучасным медабсталяваннем, кваліфікацыя ўрачоў высокая. Мы гатовы выканаць усё на месцы, у поўным аб’ёме і высокакваліфікавана.











«ШКОЛЬНЫ ДЗЁННІК»



РЭКЛАМА

Загадчык аддзялення ўльтрагукавой дыягностыкі Аляксандр Літвіненка — вопытны прафесіянал

– Якія платныя медыцынскія паслугі самыя запатрабаваныя?

– Увогуле, наша бальніца аказвае паслугі па 17 накірунках: стаматалагічныя, эндаскапічная і ультрагукавая дыягностыка, рэнтгеналагічныя, акушэрскія і гінекалагічныя, оталарынгалагічныя, афтальмалагічныя і іншыя абследаванні, фізіятэрапеўтычныя працэдуры. Самыя запатрабаваныя – дыягнастычныя метады абследавання ўсіх унутраных органаў, сасудаў, шчытападобнай і малочнай залозаў. Кошт працэдур – ад 3,19 да 15,90 рубля. Не менш запатрабаванае і дыягнастычнае эндаскапічнае абследаванне стрававода, страўніка і дванаццаціперснай кішкі, тоўстага кішэчніка. Нядаўна ляхавіцкія медыкі пачалі рабіць калонаскапію пад наркозам, што дазваляе бязбольна і, адпаведна, больш поўна правесці абследаванне.



Эндаскапічнае абследаванне праводзяць загадчык эндаскапічнага кабінета Павел Тупальскі і медсястра Ала Леваш

– Ці карыстаюцца попытам платныя стаматалагічныя паслугі ад райбальніцы?


– Безумоўна. Больш таго, за стаматалагічнай дапамогай у ЦРБ прыязджаюць не толькі ляхавічане, але жыхары суседніх раёнаў. Прыцягвае і кошт, і якасць лячэння. Нашы стаматолагі пастаянна павышаюць узровень прафесійных ведаў і навыкаў, удзельнічаюць у міжнародных трэнінгах, укараняюць новыя метады абследавання і лячэння. Напрыклад, адзін з урачоў пры лячэнні выкарыстоўвае відэакамеру – увесь працэс цяпер і на экране.

Сярод стаматалагічных паслуг запатрабавана зубное пратэзаванне.









Видеоканал "Ляховичи и ляховичане". События, люди, мнения



– А што наконт фізіяпрацэдур?

– У нашым аддзяленні фізіятэрапіі самы шырокі спектр паслуг, выдатны эфект ад іх прымянення, прафесійныя работнікі. Тут вам прапануюць масаж (пры адсутнасці медыцынскіх паказанняў) – ад 0,99 да 3,96 рубля за сеанс, падводны душ-масаж, душ Шарко (3 і 1,5 рубля адпаведна). Запатрабаваны электрафарэз пастаянным, імпульсным токамі, электрасон, магнітатэрапія, лекавыя і ультрагукавыя інгаляцыі, гальванізацыя. Зразумела, гэта далёка не ўвесь пералік паслуг.

На ўсе фізіяпрацэдуры можна трапіць па папярэднім запісе з 8.00 да 20.00 у рабочыя дні і да 15.00 у суботу (у нядзелю – выхадны). Пагадзіцеся, розныя варыянты аздараўлення ў крокавай даступнасці дазваляюць зняць напружанне, адпачыць, падмацаваць арганізм: няма неабходнасці ехаць у санаторыі.



Лячэбная працэдура ад медсястры па масажы Вольгі Войцік

– Георгій Яўгеньевіч, якія новыя віды платных паслуг з’явіліся ў райбальніцы?

– Сярод нядаўна ўкаранёных – псіхалагічная дыягностыка пры праходжанні вадзіцельскай камісіі (па накіраванні нарколага), паслугі псіхатэрапіі дарослым, дзецям, усёй сям’і.

Здараюцца сітуацыі, калі вадзіцель не згодны з вынікамі агляду на факт ужывання алкаголю, наркатычных і таксічных рэчываў. У такім выпадку можна на платнай аснове зрабіць у райбальніцы паўторны аналіз. Кошт пытання – 15,28 рубля. Паслугай вывядзення з запою (ад 70 да 100 рублёў) можна скарыстацца і на ананімных умовах (без пастаноўкі на наркалагічны ўлік).

Президент Республики Беларусь

БРЕСТСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

ЛЯХОВИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

НАШИ ЦЕЛИ

ЦЕЛИ УСТОЙЧИВОГО РАЗВИТИЯ В БЕЛАРУСИ



Ванну для чарговага пацыента рыхтуемедсястра па фізіятэрапіі Лілія Хлапянік

– Георгій Яўгеньевіч, а наколькі «пад'ёмная» цана пытання?
– Цэны, без сумненняў, можна назваць дэмакратычнымі. Ні адна паслуга не каштуе даражэй, чым у суседзяў, некаторыя ў нас больш танныя. Напрыклад, УГД-абследаванне органаў малога таза ў цяжарных у Ляхавіцкай райбальніцы каштуе каля
6 рублёў, а УГД сэрца – ад 14 рублёў. Параўнаць з прайс-лістом ад іншых можа кожны.

– Дзе можна знайсці больш падрабязную інфармацыю пра платныя паслугі райбальніцы?
– Пералік медыцынскіх платных паслуг пастаянна пашыраецца. На сайце Ляхавіцкай ЦРБ www.lcrb.by ёсць асобная старонка з актуальнай інфармацыяй пра платныя паслугі і іх кошт. Парадак атрымання паслуг можна ўдакладніць і па тэлефонах 2-20-11, 2-34-51 або звярнуцца да свайго ўчастковага ўрача ці **медсястры. Нашы спецыялісты не толькі раскажуць пра магчымасці, але і падбяруць зручны для вас час.**
Гутарыла Маргарыта КУХТА.
Фота аўтара.

ФАКТЫ

Эксперты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя лічаць, што здароўе чалавека на 50 працэнтаў залежыць ад ладу яго жыцця, на

У аддзела рэкламы «ЛВ» новы нумар тэлефона 6 09 08

Навіны БелТА

Опросы

Достаточно ли озеленён город? Устраивает ли качество городского озеленения?

- ☐ да, озеленён достаточно, посадки ухожены
- ☐ да, озеленён достаточно, но посадки недостаточно ухожены
- ☐ нет, озеленён недостаточно, но посадки ухожены
- ☐ нет, озеленён недостаточно, посадки недостаточно ухожены

Голос

Просмотреть результаты

Каких видов зелёных насаждений, на ваш взгляд, не хватает в городе?

- ☐ газонов
- ☐ цветников и клумб
- ☐ кустарников
- ☐ деревьев
- ☐ ваш вариант

> 20 працэнтаў – ад умоў навакольнага асяроддзя, на столькі ж працэнтаў – ад яго генетычнага кода (спадчыннасці) і толькі на 10 – ад якасці медыцынскага абслугоўвання.

> Запатрабаваныя ў пацыентаў лабараторныя даследаванні на сучасных аналізатарах, з дапамогай якіх вызначаецца канцэнтрацыя тырэатропнага гармону, прастат-спецыфічнага і ракава-эмбрыянальнага антыгенаў. Кошт паслугі – ад 2,99 да 3,85 рубля. Такія даследаванні дазваляюць выявіць анкалагічныя захворванні на ранніх стадыях.

> Сярод платных прапаноў – палаты павышанай камфортнасці ў стацыянары хірургічнага, тэрапеўтычнага і неўралагічнага аддзяленняў (ад 7,1 да 7,5 рубля за суткі).

> Калі ў пацыента няма часу чакаць прыёму ўрача па талончыку, без чаргі на платнай аснове можна атрымаць кансультацыю практычна ўсіх спецыялістаў (ад 6,64 да 11,1 рубля).

одноклассники

← В Ляховичском районе на пожаре погиб человек

Православные христиане празднуют Благовещение Пресвятой Богородицы →

Голос

Просмотреть результаты

Вы готовы принять участие в благоустройстве и озеленении города?

- ☐ да
- ☐ нет
- ☐ не знаю/ затрудняюсь ответить

Голос

Просмотреть результаты

Ляхавіцкі край вачамі патэнцыяльнага турыста



Наш архіў

Выберите месяц

Рубрыкі сайта

Выберите рубрику

Урачэбная кансультацыя

Вам также понравится



Айчынныя лекі абыдуцца танней. Ляхавіцкая аптэка — удзельніца рэспубліканскай акцыі

15/06/2016 0



«Вінаваты» трайчасты нерв

09/11/2018 0



1снежня – Сусветны дзень барацьбы са СНІДам

01/12/2016 0

Добавить комментарий


Ваш e-mail не будет опубликован. Обязательные поля помечены *

Комментарий

Имя *

E-mail *


Сайт




Каляндар

Февраль 2024

Пн	Вт	Ср	Чт	Пт	Сб
			1	2	3
5	6	7	8	9	10
12	13	14	15	16	17
19	20	21	22	23	24
26	27	28	29		
« Янв					






Отправить комментарий







Каментарыі


Елена к записи «Ляхавіцкі веснік» аб’явіў конкурс, дзе ў галоўнай ролі — … ведзьмачка

Елена к записи У саюзе з друкам. Гэтымі днямі Белсаюздрук адзначае стогадовы юбілей

Читать и ещё раз читать к записи Яркі падарунак

О комментировании на сайте газеты "Ляхавіцкі веснік"

Надвор`е ў Ляхавічах



Ляхавічы на карце



Карта сайта

Галоўная

РУБРЫКІ

- У цэнтры ўвагі
- Единый день голосования
- Навіны
- Грамадства

При перепечатке материалов гиперссылка на сайт http://www.lves.by/ обязательна
Копирайт © 2024 Ляховичи. Ляховичский вестник. Ляхавіцкі веснік. Новости города Ляховичи Брестской области. Все права защищены.
Рейтинг@Mail.ru
1 093
540
475